11. *Ленин, В. И.* Полное собрание сочинений : в 55 т. / В. И. Ленин. — М. : Политиздат, 1965—1975. — Т. 24. Сентябрь 1913 — март 1914 г. — 1973. — 568 с.
12. *Таболаў, К.* Нацыянальнае пытаньне на XVI Зьезьдзе УсеКП(б)Б з дадаткам перад. арт. «Правды» / К. Таболаў. — Менск : БДВ, 1930. — 42 с.
13. Национальное образование в России: концепции, взгляды, мнения, 1905—1938 гг. : сб. док. : в 2 ч. — М. : ИНПО, 2002. — Ч. 2. — 312 с.
14. *Чарнецкі, Я.* Перабудаваць работу, забясьпечыць тэмпы / Я. Чарнецкі // Комуніст. выхаваньне. — 1930. — № 2. — С. 25—39.
15. *Сталин, И. В.* Марксизм и национально-колониальный вопрос / И. В. Сталин. — М. : Партиздат ЦК ВКП(б), 1937. — 232 с.
16. Трынаццаты зьезд Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі, 30 мая — 12 чэрв. 1930 г. Стэн. справ. — Менск : БДВ, 1931. — 830 с.
17. Пастанова Народнага камісарыяту Юстыцыі БССР. Натарыяльная інструкцыя // Бюлетэнь Народных Камісарыятаў і Цэнтральных устаноў Беларускай ССР. — 1932. — № 5. — С. 4.
18. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. — Ф. 126. Воп. 1. Спр. 8.
19. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 701. Воп. 1. Спр. 100.
20. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 701. Воп. 1. Спр. 103.
21. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 5606.
22. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 265. Воп. 1. Спр. 2944.
23. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці. — Ф. 5. Воп. 1а. Спр. 313.
24. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 5013.
25. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 4757.
26. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 15-п. Воп. 4. Спр. 560.
27. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 6099.
28. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 5475.
29. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 10969.
30. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 6343.
31. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 7747.
32. *Тишков, В. А.* Этнополитология: политические функции этничности / В. А. Тишков, Ю. П. Шабаев. — М. : Изд-во Моск. ун-та, 2011. — 376 с.
33. *Сталин, И. В.* Марксизм и национально-колониальный вопрос / И. В. Сталин. — М. : Партиздат ЦК ВКП(б), 1937. — 232 с.
34. *Платонов, Р. П.* Перед крутым поворотом / под общ. ред. Р. П. Платонова. — Минск : БелНИИДАД, 2001. — 310 с.
35. ЦК РКП(б) — ВКП(б) и национальный вопрос : сборник : в 2 кн. — М., 2005. — Кн. 1. : 1933—1945. — 784 с.
36. *Сталін, І. В.* Нацыянальнае пытанне і ленінізм / І. В. Сталін. — Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1951. — 19 с.
37. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 12832.
38. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 9116.
39. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 14721.
40. *Гікала, М. Ф.* Савецкая Беларусь / М. Ф. Гікала. — Менск : Белпартвыдавецтва ЦК КП(б)Б, 1937. — 51 с.
41. Больш увагі рускім пісьменнікам Беларусі // Літаратура і мастацтва. — 1939. — 30 студз. — С. 1.
42. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 13225.
43. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 12309.
44. Савецкая Беларусь / пад рэд. В. В. Бедзіна, І. Шапавалава, М. Т. Лынькова. — Менск : ДВБ, Аддзел паліт. літ., 1938. — 92 с.
45. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 5068.
46. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 6898.
47. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 13233.
48. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 13267.
49. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 7184.
50. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 11021.
51. *Люторович, П. В.* Искусство советской Белоруссии / П. В. Люторович. — Минск : Госиздат БССР, ред. мас.-пол. лит., 1959. — 138 с.
52. *Платонаў, Р. П.* Лёсы / Р. П. Платонаў. — Мінск : БелНДІДАС, 1998. — 326 с.
53. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 13225.
54. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 13246.
55. *Калинин, М. И.* Об образовании Еврейской автономной области / М. И. Калинин. — М. : Эмес, 1934. — 23 с.
56. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 12400.
57. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 12451.
58. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 13275.
59. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 10870.
60. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 42. Воп. 1. Спр. 2131.
61. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 10870.
62. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 7125.
63. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 13323.
64. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 11638.
65. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 13224.


УДК 355.018

**В. М. Бабылёва, З. М. Казлова**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА Ў ПАМЯЦІ ПАКАЛЕННЯ XXI СТАГОДДЗЯ

Другая сусветная вайна, якая сышла ў гісторыю разам з XX ст., па сваіх маштабах, жорсткасці, людскіх і матэрыяльных стратах не мае сабе роўных. Яна прайшла праз лёсы $^4/_5$ насельніцтва зямнога шара. Ваенныя дзеянні вяліся на шырокіх кантынентальных і марскіх прасторах. У вайне загінулі каля 60 млн чалавек. Сярод іх, паводле апошніх дадзеных, — кожны трэці жыхар Беларусі, а гэта найбольшыя страты сярод народаў СССР [1, с. 239].

© Бабылёва В. М., Казлова З. М., 2018

Репозиторий БарГУ

830 тыс. ураджэнцаў Беларусі з 1 млн 300 тыс. нашых землякоў, якія ваявалі ў радах Чырвонай Арміі, загінулі на палях бітваў. Аддалі сваё жыццё дзеля вызвалення роднай зямлі амаль 45 тыс. партызан і падпольшчыкаў. Ва ўмовах жорсткага акупацыйнага рэжыму ад голаду, эпідэмій, нягод памерлі каля 800 тыс. чалавек мірнага насельніцтва. Гітлераўцы гвалтоўна вывезлі з Беларусі на прымусовыя работы ў Германію каля 400 тыс. чалавек, у тым ліку 24 тыс. дзяцей. Вярнуліся дадому пасля вайны толькі 160 тыс. чалавек [2, с. 36]. Пералік ахвяр Вялікай Айчыннай вайны можа быць бясконца доўгім, бо вайна прайшла праз кожную беларускую сям'ю, прама ці ўскосна закранула кожнага нашага суайчынніка.

Многія пасляваенныя дзесяцігоддзі ў выдадзеных у СССР, і ў тым ліку Беларусі, фундаментальных даследаваннях, манаграфіях, мемуарах, падручніках не прынята было пісаць пра праблемы паўсядзённасці, пакуты і перажыванні людзей ва ўмовах вайны. Толькі на мяжы XX—XXI стст. пасля палітычных перамен гераічныя старонкі Вялікай Айчыннай вайны пачалі дапаўняцца тэмамі, якія да гэтага часу заставаліся забароненымі не толькі для даследаванняў, але і нават для абмеркавання. Пачынаюць вывучацца праблемы «астарбайтараў», калабарацыянізм, Халакост, сацыяльныя і псіхалагічныя аспекты жыцця чалавека ў ваенны час.

У 30-я г. XX ст. французскі гісторык Марк Блок разам з Люцэнам Феўрам з'явіліся заснавальнікамі гістарычнага напрамку, які атрымаў назву «школы Аналаў». Прыхільнікі гэтага напрамку, якія групаваліся вакол часопіса «Аналы», лічылі, што сапраўднае разуменне гісторыі прыходзіць праз суперажыванне. Суперажываць чалавек можа, засноўваючыся на канкрэтным вопыце. У першую чаргу такім вопытам можа быць сустрэча і размова з чалавекам, які асабіста перажыў, прапусціў праз сябе гістарычныя падзеі. Менавіта такі вопыт і перажыванне гісторыі вайны ў беларускіх сем'ях з'яўляецца прадметам вывучэння ў нашым даследаванні, у ходзе якога былі сабраны і прааналізаваны запісаныя маладымі людзьмі 17—20-гадовага ўзросту, студэнтамі ўстановы адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт» падзеі Вялікай Айчыннай вайны, захаваныя ў памяці іх сямей (84 працы). Працуючы з пісьмовымі разважаннямі пра тое, якія і якімі рэаліі вайны засталіся ў памяці іх сем'яў, мы не ставілі мэтай рэканструяваць гістарычныя падзеі. Дадзеныя сведчанні суб'ектыўныя, большасці ўдзельнікаў і сведкаў вайны ўжо няма ў жывых, а ёсць памяць блізкіх да іх людзей: дзяцей, унукаў, праўнукаў. Ёсць рэальныя падзеі, іх перажыванні, прапушчаныя праз суб'ектыўныя пазіцыі некалькіх пакаленняў.

Часцей за ўсё атрыманая намі інфармацыя не толькі пра тое, што чалавек рабіў, але і пра тое, што чалавек хацеў і мог зрабіць, што ён сам і яго нашчадкі пра гэта думаюць, як да гэтага ставяцца. Адна са студэнтак напісала: «...Нягледзячы на тое, што я так і не ўбачыла свайго дзядулю, я ганаруся тым, што я яго ўнучка. Я ганаруся, што ў маёй крыві цячэ патрыятызм, прастата, неадступнасць і любоў, любоў да жыцця» (К. С. пра прадзядулю Валасюка Івана Паўлавіча). Другая разважае: «Але што на самой справе прыносіць вайна простым людзям?... Як гэта, ляжаць ў акопе ў саракаградусны мароз? Ці жыць на чатырыста грамаў хлеба ў дзень? А з чым можна параўнаць боль жанчыны, якая атрымала пахаванку на мужа ці сына? Ці адчуванні дзяўчыны, якая адправіла на вайну хлопца, а дачакалася скалечанага інваліда? Я зараз назіраю за промнем сонца. Ён цёплы і ласкавы. Я ведаю, што за захадам сонца будзе ўсход. А якім ён будзе, цёплым і ласкавым ці жорсткім і крывавым, залежыць ад нас. І нараджаецца адчуванне: не трэба больш вайны. Ніколі...» (Т. Б.)

Першае, на што звяртаецца ўвага пры знаёмстве з працамі маладых людзей, гэта ступень іх інфармаванасці. Яна вагаецца ад дастаткова поўнага аднаўлення карціны перажытага дзядулямі, бабулямі, іншымі блізкімі сваякамі, наяўнасці фотакартак да поўнага няведання:

«Я шмат пыталася ў таты пра свайго прадзядулю. Нягледзячы на адсутнасць абедзвюх ног, ён стварыў вялікую і моцную сям'ю, пабудаваў тры вёскі, пражыў доўгае жыццё. Бабуля аддала ўсе яго ўзнагароды і фатаграфіі ў музей Брэсцкай крэпасці, дзе яны і захоўваюцца. Памяць пра Занцэвіча Івана Якаўлевіча жыве і па гэты дзень… Я ўдзячная прадзеду за сваё жыццё» (І. К. пра прадзеда Занцэвіча Івана Якаўлевіча).

«Мы часта разглядаем дзедавы ваенныя фотакарткі, лісты-паштоўкі, узнагароды… Калі маці дастае ордэны і медалі, яны быццам свецяцца ў яе руках… Я ганаруся…» (Г. С. пра дзядулю Якаўлева Аляксанда Рыгоравіча).

«Крыніцы сямейнай памяці пра вайну — апавяданні бабулі… і баявыя ўзнагароды дзеда, якія захоўваюцца ў сям'і…».

«Мая бабуля (дзяўчына, якая чакала любімага хлопца доўгія гады) беражліва захоўвала яго франтавыя рэліквіі, якія дрыжачым рукамі перадавала дзецям і ўнукам…» (А. К.).

Ёсць і іншыя запісы:

«…служыў… удзельнічаў… знаходзіўся…»;

«…вайну я бачыла ў кіно, пра яе чытала ў кнігах…»;

«…На жаль, дакладных звестак пра яго я не маю… Ведаю толькі, што яго імя Фёдар, …пасля вайны не доўга жыў, праз раненне і рана памёр…» (А. У.);

«…размовы пра тыя часы ў нашай сям'і імкнуцца не пачынаць, не ведаю чаму…» (В. С.).

Аналіз прац паказаў прысутнасць у памяці, якая дайшла да маладых нашчадкаў, разнастайных бакоў удзелу іх продкаў у падзеях тых пакутных гадоў. Так, больш за палова (54%) сямейных успамінаў, адлюстраваных у працах, звязаны з успамінамі членаў сям'і аб вызваленні. Сярод сваякоў, пра якіх



Репозиторий БарГУ

распавядаецца ў аналізуемых працах, нячаста сустракаюцца франтавікі, якія прайшлі вайну. Вярнуліся з фронту жывымі, але часта хворымі і не аднойчы параненымі менш за 40% прызваных у армію жыхароў Беларусі. У 23% прааналізаваных работ распавядаецца пра выжыванне і стойкасць ва ўмовах акупацыйнага рэжыму; пры тым што сучасным маладым людзям часта вельмі цяжка уявіць жыццё, цалкам пазбаўленае элементарнага камфорту, калі галоўнае не «даброты», а выжыць, ацалець самім і выратаваць сваіх блізкіх. «Жыць у вёсцы было вельмі цяжка. Немцы адбіралі ежу і скаціну. За непадпарадкаванне каралі, не шкадуючы ні старых, ні малых. Аднойчы ўсіх жыхароў сагналі ў адрыны і трымалі некалькі дзён. Некаторыя хлявы падпальвалі. Тых, хто выжыў, вывозілі ў Германію» (А. С.). «...Ганне было вельмі цяжка адной з маленькімі дзецьмі, але яна разумела, што каханаму яшчэ цяжэй. Ганне Іванаўне прыйшлося жыць на балоце з маленькімі дзецьмі... З-за балотнай вады і жудасных умоў памерлі ўсе чацвёра дзетак Уладзіміра і Ганны» (К. С. пра сваіх прадзеда і прабабулю).

Успаміны пра партызанскае мінулае продкаў складаюць 16% ад агульнай колькасці эсэ, падрыхтаваных маладымі людзьмі. «Дзед шмат расказваў аб тым, як жылі ў буданах, як капалі акопы, як дзялілі апошнюю дробку махоркі, пра валёнкі, якія ніяк не было магчыма высушыць, пра палову кацялка вадкай пшоннай кашы на дваіх. Сагравала думка, што дома чакаюць» (А. К. пра дзеда Каховіча Міхаіла Іванавіча).

Прысутнічаюць таксама ў сямейнай памяці нашчадкаў, хоць і без жудасных падрабязнасцяў, пэўна, згладжаных часам, звесткі аб нялёгкім мінулым, звязаным з прымусовымі працамі на розных тэрыторыях нашай краіны і за яе мяжой, так званых «астарбайтараў» (12% юнакоў узгадваюць такія сведчанні), а таксама лёс блізкіх, схаваных за сцянамі канцэнтрацыйных лагераў (6%). Кацярына К. піша пра пакуты свайго прадзеда Шутка Сцяпана Якаўлевіча: «Мой прадзядуля Сцяпан быў ураджэнцам Украіны. Трапіў у палон, потым у канцлагер, які знаходзіўся на тэрыторыі Беларусі. Фашысты здзекаваліся з палонных. Аб санітарных умовах не магло ісці нават гаворкі, там стаяў жудасны смурод. Вязняў па двое прывязвалі да слупа. Ноч. Холадна. Раніцай высветлілася, што хлопец, які быў прывязаны разам з дзедам, памёр. Так непрыкметна пайшла з жыцця душа». «Мая прабабуля трапіла ў палон да нямецкіх фашыстаў ва ўзросце сямнаццаці гадоў. На працягу трох гадоў яна працавала не падымаючы галавы, збірала дэталі самалётных канструкцый. Фашысты не даравалі прамаруджвання ў працы, трымалі палонных на холадзе і мала кармілі. Адзінай радасцю быў маленькі кавалачак бручкі, які выдзялялі два разы на дзень, які нельга было нават годна прыгатаваць. Палонныя, каб хоць як палепшыць свой “абед”, проста прыкладалі яе да печкі-буржуйкі, каб крыху прагрэць. Ад голаду многія людзі хварэлі, іх твары распухалі, ацякалі, а цела худнела» (В. М. аб прабабулі Паўлоўскай Юзэфе Іванаўне).

Расказваючы гісторыю сваёй сям'і, маладыя людзі часта апавядаюць не толькі пра падзеі, але і пра тое, як яны паўплывалі на будучыню:

«Прабабулі і прадзядулі атрымалі жудасныя траўмы — фізічныя і маральныя»;

«Вярнуўся, працаваў кавалём, за самаадданую працу атрымаў медаль» (М. Ж. пра прадзеда Панасюка Максіма Сільвестравіча);

«Вярнуўся дадому пакалечаны, але жывы. Ён застаўся без ног, але гэта не забіла яго дух, а толькі загартавала» (І. К. пра прадзеда Занцэвіча Івана Якаўлевіча)

«Прадзед вярнуўся зусім іншым чалавекам. Вайна зрабіла яго чэрствым і пазбавіла радасці жыцця. Ён ніколі не распавядаў пра вайну, не жадаў успамінаць перажытае зноў…» (А. Дз. пра свайго прадзеда);

«Мае прабабуля Марыя і прадзядуля Васіль пазнаёміліся менавіта на гэтай жудаснай вайне. Ён працаваў урачом у шпіталі, а яна — палявой медсястрой. Яна ўбачыла дзеда, калі цягнула на сабе параненага салдата, які сцякаў крывёй. Дзядуля без разважанняў кінуўся на дапамогу. Так і пазнаёміліся. Бабуля сем разоў магла памерці, але яе быццам нехта зберагаў. Амаль усю вайну яны з дзедам ратавалі чужое жыццё, У красавіку 1945 г. дзядуля падарваўся на міне, спяшаючыся на дапамогу чарговаму параненаму. Бабуля адна выгадавала сына, які нарадзіўся ўжо пасля заканчэння вайны» (А. А. пра прадзеда Васіля і прабабулю Марыю);

«Праз некалькі дзён пасля аб'яўлення перамогі Чырвонай Арміі над фашысцкай Германіяй маленькі хлопчык 7 гадоў, брат маёй прабабулі, мой кроўны родзіч, выйшаў пагуляць у чыстае поле. За ўсе гады вайны ніводнай міны не было падарвана ў гэтым месцы. Здаецца, яна чакала заканчэння вайны. Пачуўшы моцны выбух, прабабуля выбегла ў двор і ўбачыла вялізны слуп пылу. Увайшоўшы ў яго, яна ўбачыла цела хлопчыка, якое было цэлым, але бездыханным. Гэта было так балюча…» (А. Н. аб прабабулі Сімаковіч Ганне Антонаўне).

У нашага народа сфарміравалася багатая культура памяці падзей Вялікай Айчыннай вайны. Мемарыяльныя комплексы «Брэсцкая крэпасць», «Хатынь», «Курган Славы», «Чырвоны Бераг», мемарыялы «Прарыў» ва Ушацкім раёне, у гонар Маці-патрыёткі ў Жодзіне і іншыя атрымалі сусветную вядомасць. Помнікі і мемарыялы, якія ўвекавечваюць памяць пра вайну, узведзены амаль ва ўсіх гарадах і пасёлках, у многіх вёсках нашай рэспублікі. Імёны воінаў, партызан, падпольшчыкаў увекавечаны ў назвах паркаў, плошчаў, праспектаў, вуліц гарадоў і гарадскіх пасёлкаў.

Традыцыя гераізацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны і ўдзельнікаў яе ў партызанскай рэспубліцы захоўваецца. Але гэта толькі адзін з бакоў нашай культуры памяці. Ён мае права на існаванне і патрэбу ў дапаўненні. Лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій Рэспублікі Беларусь архітэктар і скульптар Леанід Левін і прафесар з Германіі Манфрэд Цабель пісалі: «У мемарыяльным комплексе “Хатынь” ваенныя



Рэпазіторый БарДУ

падзеі раскрыты на прыкладзе канкрэтнай вёскі, хат, на тым месцы, дзе яны стаялі, дзе былі пахаваныя тыя, хто загінуў, і на прыкладзе аднаго чалавека, які выжыў. Наведвальнік перажывае трагедыю непасрэдна на тым месцы, куды ён прыехаў» [3, с. 6].

Разуменне моладдзю вайны як трагедыі Чалавека адбываецца праз разуменне трагедыі блізкіх, тых, хто выжыў і перажыў жах, страх, нягоды. Доўгі час лічылася, што на першым месцы павінна знаходзіцца перамога Чырвонай Арміі, а трагедыя была на другім плане. Але ж удзельнікамі трагедыі са шматлікімі чалавечымі, у тым ліку і дзіцячымі, ахвярамі на тэрыторыі нашай рэспублікі былі мільёны людзей. Зараз усё часцей успамінаюць пра раней забытых ахвяр вайны, пра паўсядзённае жыццё ва ўмовах акупацыі, пра нягоды першых пасляваенных гадоў. Публікуюцца захаваныя апавяданні сведкаў вайны, ветэранаў, былых прымусовых рабочых, вязняў канцэнтрацыйных лагераў і гета. У сямейных архівах з дакументамі і ўзнагародамі, фотаздымкамі, успамінамі, якія запісаны ці вусна перадаюцца з пакалення ў пакаленне, захоўваецца гісторыя Вялікай Айчыннай вайны, якой яна была — гераічная і трагічная.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны) : учеб. пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высш. образования / А. А. Коваленя [и др.] ; под ред. А. А. Ковалени, Н. И. Сташкевича ; пер. с белорус. яз. А. В. Скорохода. — Минск : Издат. центр БГУ, 2004. — 279 с.
2. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны) : материалы для самостоят. работы / Н. А. Глушакова [и др.]. — Горки : БГСХА, 2013. — 106 с.
3. Спасённая жизнь : жизнь и выживание в Минском гетто / сост. В. Ф. Балакирев [и др.]. — Минск : Лимариус, 2010. — 100 с.

УДК 316.7(476)

**П. К. Банцевич, П. Т. Стецкевич**
*Учреждение образования «Гродненский государственный аграрный университет», Гродно*

## ДЕФОРМАЦИЯ СОЦИОКУЛЬТУРНОЙ ИДЕНТИЧНОСТИ В КОНТЕКСТЕ СИСТЕМНОЙ ТРАНСФОРМАЦИИ БЕЛОРУССКОГО ОБЩЕСТВА

Проблема социально-культурной идентичности относится к разряду приоритетных в современном обществознании, поскольку она имеет непосредственный выход в социальную практику, отношение к процессам социального управления. Невозможно определить основные направления и стратегии развития государства, не учитывая характер, специфику и ведущие тенденции развития социально-культурной идентичности общества. Будущее любой страны в значительной степени определяется теми жизненными и ценностными установками, моделями поведения и деятельности, которые доминируют в массовом сознании. Концептуальное осмысление процессов, связанных с социально-культурной идентичностью, является теоретико-методологическим основанием разработки эффективных механизмов предотвращения и разрешения социальных конфликтов, а также проектирования результативных социальных технологий.

Одним из мощных факторов, влияющих на формирование социально-культурной идентичности современного общества и определяющих доминирующие тренды ее деформации, является глобализация. Глобализация — это сложная и противоречивая реальность настоящего, реальность крайне динамичная, в силу чего требующая постоянного пристального внимания исследователей. Именно поэтому все проблемы, связанные с ней, относятся к числу наиболее значимых. Глобализация — процесс всемирной экономической, политической и культурной интеграции и унификации. Мировое хозяйство, которое совсем недавно понималось как совокупность национальных хозяйств, связанных друг с другом системой международного разделения труда, экономических и политических отношений, втягивается в мировой рынок с тесным переплетением экономик на основе транснационализации и регионализации. На этой базе происходит формирование единой мировой сетевой рыночной экономики — геоэкономики и её инфраструктуры, разрушение национального суверенитета государств, являвшихся главными действующими лицами международных отношений на протяжении многих веков. Происходит мировое разделение труда, миграция в масштабах всей планеты капитала, рабочей силы, производственных ресурсов, стандартизация законодательства, экономических и технологических процессов, а также сближение и слияние культур разных стран. Это объективный процесс, который носит системный характер, т. е. охватывает все сферы жизни общества. В результате глобализации мир становится более связанным и более зависимым от всех его субъектов. Происходит как увеличение количества общих для группы государств проблем, так и расширение числа и типов интегрирующихся субъектов. Происхождение самого слова «глобализация» указывает на то, что ведущую роль в данном процессе играет бурный рост международной торговли. Глобализация нередко

© Банцевич П. К., Стецкевич П. Т., 2018



Репозиторий БарГУ